■ Вёскі, якія знікаюць

# НОВЫ ГОД У ЁЛКАХ

## СЁЛЕТА БУДУЦЬ СУСТРАКАЦЬ ТРЫ ЧАЛАВЕКІ

**Чамусьці я чакала ўбачыць у Ёлках шмат аднайменных дрэў. Але іх тут амаль няма. Вялікая елка расце на ўчастку аднаго з апошніх жыхароў вёскі. Дык ён узяў і пазразаў усе ніжнія лапы. І дрэва стаіць амаль голае. Можа, засыхаць пачынала елачка, а можа, гаспадару для нечага спатрэбіліся галіны. На сваім участку чалавек мае права распараджацца прадстаўнікамі расліннага свету. А вось прыгажосці пейзажу лысае дрэва яўна не прыбавіла. Ды і ўся вёска пакідае ўражанне населенага пункта, які дажывае, хоць знаходзіцца яна зусім побач з Івацэвічамі, райцэнтрам.**

Паводле афіцыйных даных, у Ёлках зарэгістравана чатыры жыхары. Рэальная карціна крыху адрозніваецца, але зусім не намнога. Дарэчы, гэта вёска ніколі не была асабліва вялікай. Перад вайной тут значылася 88 жыхароў, а ў 50-х гадах крыху больш за пяцьдзясят. Войны прайшліся па Ёлках з усёй сваёй разбуральнай сілай. У Першую сусветную побач з вёскай праходзіла нямецкая лінія ўмацаванняў, сляды ад якой засталіся і цяпер. У Другую сусветную сяло спалілі амаль усё.

Вера Пятроўна Міхнюк згадвае, як вярнуліся з лесу пасля расправы над вёскай, як жылі ў суседзяў, хата якіх, па шчасці, ацалела. Палілі, вядома, за сувязь з партызанамі. Маці яе таксама пякла хлеб і насіла ў лес, у партызанскім атрадзе знаходзіліся сваякі.

— А мы нацярпеліся ад усялякіх ліхіх людзей у вайну! — расказвае карэнная жыхарка Ёлак. — Прыходзілі людзі, мусіць, салдаты, якія адсталі ад сваіх часцей, патрабавалі ежу, пагражалі расстрэлам. А калі б немцы даведаліся, што ім хлеб давалі, таксама забілі б. Так і жылі дзень за днём у страху. Потым вось спалілі.

Пазней, ужо пасля вайны, калі калгасы сталі, нам выдзелілі пустую паўразваленую хату, яе перавезлі канём з суседняй вёскі, неяк злажылі.

Жыццё прайшло. Браты мае паўміралі. Адна я во засталася. 15 лютага будзе 87 гадоў. Цяжка цяпер дажываць.

— А ў дзяцінстве мама возьме за руку, ідзём у царкву ў Яглевічы. Царква прыгожая была, людзі ўсе па-святочнаму апранутыя. Радасць на душы, спакой. Я ўсё жыццё ў царкву хадзіла. Гэтай зімой толькі не хаджу, ногі баляць. Але як да вясны дажыву, то абавязкова пайду. На Вялікдзень трэба быць у царкве.

Вера Пятроўна расказвае, што замуж выйшла позна, за ўдаўца нашмат старэйшага. Але пражылі ў згодзе са сваім гаспадаром 23 гады. Потым, калі пахавала мужа, яго дачка ад першага шлюбу не забывалася мачаху. Прыязджалі з мужам, дапамагалі па гаспадарцы. Потым дачка памерла, дык яе муж, што жыве ў Мінску, часам наведвае. Ды ён і сам у гадах, прыязджае зараз рэдка. Пакуль магла, паціху жыла ў сваёй хаце, але гэтай восенню старшыня сельскага Савета Валянціна Бязносік угаварыла пенсіянерку пайсці на сацыяльны ложак у бальніцу. І яна ўжо, лічы, пагадзілася.


Вера МІХНЮК.

— У той жа дзень прыехалі пляменнікі, сталі сварыцца: «Што ж мы, родную цётку не дагледзім? Перад людзьмі сорам, каб ты ішла ў прытулак для адзінокіх», — расказвае бабулька, і відаць, што ганарыцца братавымі сынамі.

Адным словам, перавёз пляменнік Валерый цётку Веру ў сваю хату. І цяпер адзінокі мужчына, які па стане здароўя вымушаны быў некалькі гадоў таму пакінуць работу, даглядае сваю маці Ніну Аляксандраўну і цётку Веру Пятроўну.

— Ён сам і есці варыць, і прыбірае, — расказвае Вера Міхнюк. — Можа, і цяжкавата яму з дзвюма старымі, але ж спраўляецца. Калі з пенсіі даю яму грошы, нават браць не хоча. Бо я ж яшчэ ў магазін сама хаджу, купляю сёе-тое з прадуктаў. Вось так і жывём...

Жыхарка Ёлак падзялілася планамі вясной зноў вярнуцца ў сваю хату. У суседкі ў склепе яна паклала бульбу, моркву, буракі, што вырасціла ў агародзе. Калі будуць сілы, зноў пасадзіць. Кажа, там зімаваць цяжка яшчэ і таму, што фактычна няма з кім пагаварыць. Тут жа, у Яглевічах, можна сустрэць некага з трактарыстаў альбо паляводаў, з кім працавала ў калгасе. Аказваецца, наша гераіня ўвесь час хадзіла ў перадавіках. У яе захоўваецца цэлая скрыначка грамат, пісьмаў падзякі, іншых адзнак за працоўныя поспехі. «Выходжу неяк з магазіна і чую за сабой: «Во, дык гэта ж наша звенавая!» І так прыемна, нібы ў маладосць вярнулася. Як тады працаваць было, вам і не расказаць. Сядзіш за гэтай сеялкай чорны-цёмны, пылу наглытаешся, а потым змыеш той пыл і пачуваеш сябе добра. Вечарам збіраліся, песні спявалі. Добра было і ў Ёлках, калі мы былі маладыя», — з сумнай ноткай заключае адна з апошніх жыхарак вёскі.


Вуліца ў Ёлках.

А вось самай пажылой жыхарцы Ёлак Валянціне Стрыжак 88 гадоў. З мужам Васілём Васільевічам яны зарэгістраваныя ў кватэры ў Івацэвічах, але пражываюць тут пастаянна. Шлюб яны ўзялі ў даволі сталым узросце, недзе каля 75 гадоў. Валянціна Міхайлаўна з тых жанчын, якія любяць пакрытыкаваць мужоў, як былога, так і цяперашняга. Апошняму, напрыклад, дасталося на арэхі за тое, што не расчысціў дарожку ад снегу. Але пакуль мы размаўлялі, гаспадар свой агрэх выправіў. Тым часам Валянціна Міхайлаўна, хоць і скардзілася на старэчыя немачы, але пакрысе наводзіла парадак у доме. Адразу відаць, што гаспадыня вельмі любіць чысціню.

Яшчэ адзін жыхар вёскі, той, у якога расце елка, самотна жыве на пенсіі, у яго багатай біяграфіі быў нават тэрмін пазбаўлення волі. Яго суседка, адзіная дачніца на вёсцы Ала Давыдзік, гаворыць, што цяпер вясковец паводзіць сябе ціха, нікому стараецца не перашкаджаць. Бабулька, што жыве праз адну хату, збіралася ўсё-такі пераехаць да дзяцей. Такім чынам, сустракаць Новы год у Ёлках застаюцца тры альбо чатыры чалавекі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*yackevich@zviazda.by*

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

■ Піратэхніка па правілах

# Выкарыстоўваць згодна з інструкцыяй і не парушаць грамадскі парадак

## Іншых патрабаванняў ні для горада, ні для вёскі няма

**З вёскі Зелянец Карэліцкага раёна на «гарачую лінію» нашага выдання ў трэці раз звярнуўся Мікалай Мікалаевіч ІВАНОЎ. Нагадаем коратка, што 5 лістапада газета давала адказ на запыт чытача адносна паводзін яго суседа-дачніка падчас навагодніх свят, калі той праз выкарыстанне піратэхнікі дастаўляў шмат клопату вяскоўцу і яго жонцы. Тады пракаментаваў сітуацыю начальнік раённай міліцыі. Сутнасць зводзілася да таго, што нельга замоўчваць канфлікты паміж людзьмі, іх лепш вырашаць на стадыі ўзнікнення. А для гэтага важна займацца прафілактыкай: той выпадак непаразумення паміж суседзямі быў узяты міліцыяй, як той казаў, «на аловак».**

Але праз нейкі час Мікалай Мікалаевіч папрасіў яшчэ і яшчэ раз: надрукуйце правілы выкарыстання піратэхнічных вырабаў... у сельскай мясцовасці. Сваё пытанне чытач абгрунтаваў наступным чынам: «У вас у вялікім горадзе падчас свят міліцыя сочыць за парадкам, у тым ліку і за тым, хто і як абыходзіцца з петардамі і феерверкамі. Я канкрэтна хачу ведаць, на якой адлегласці ад майго дома можна выкарыстоўваць гэтыя вырабы». Дарэмна мы спрабавалі растлумачыць, што ніякіх падобных правілаў не тое што для сельскай мясцовасці, але і для горада няма, што гэта пытанне рэгулюецца зусім інакш, чытач літаральна патрабаваў публікацыю адказу ў газеце.

**Прэс-сакратар Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Віталь НАВІЦКІ** пацвердзіў, што ёсць Правілы бяспекі пры вырабе і выкарыстанні піратэхнічных вырабаў, якія рэгламентуюць выраб, захоўванне, рэалізацыю, выкарыстанне гэтай прадукцыі, але шараговага карыстальніка яны не датычацца. Пакупнік феерверкаў і петард павінен прытрымлівацца тых правілаў, якія пазначаны ў інструкцыі па выкарыстанні таго ці іншага канкрэтнага вырабу ў залежнасці ад класа, тыпу, магутнасці і г.д. Ёсць агульныя рэкамендацыі, напрыклад, пры моцным парывістым ветры лепш увогуле адмовіцца ад правядзення феерверку (абмежаванні па хуткасці ветру пазначаны на этыкетцы кожнага канкрэтнага вырабу). Памер пляцоўкі для запуску феерверку павінен адпавядаць максімальнаму памеру небяспечнай зоны, зноў жа пазначанай на вырабах, якія плануецца выкарыстоўваць. Гледачы павінны знаходзіцца за межамі названай пляцоўкі, а над ёй не павінна быць дрэў, ліній электраперадач і іншых паветраных перашкод. У інструкцыі па выкарыстанні пазначана, як усталёўваць той ці іншы піратэхнічны выраб, як падпальваць, што нельга даваць дзецям, кідаць, падыходзіць толькі праз вызначаны час да прадмета, які не спрацаваў і г.д.

— Варта памятаць, што піратэхніку забаронена выкарыстоўваць у грамадскіх месцах: у парках, на плошчах і ў месцах з вялікай колькасцю людзей. Нельга выкарыстоўваць піратэхнічныя вырабы паблізу жылых дамоў і аўтамабіляў, — зноў жа гаворыць найперш пра меры бяспекі і правілы абыходжання з піратэхнікай **прэс-афіцэр Цэнтральнага РУУС г. Мінска Таццяна АБОЗНАЯ.** — Але трэба разумець, што адзін выпадак, калі грамадзяне выкарыстоўваюць яе згодна з правіламі, інструкцыямі на этыкетцы, нікому не перашкаджаючы і не парушаючы грамадскі парадак. Напрыклад, калі на асобнай пляцоўцы запускаюць феерверк для сябе, не ставячы мэтай напалохаць выпадковага мінака. І зусім іншая справа, калі, скажам, петарды наўмысна кідаюць пад ногі. У гэтым разе выкарыстанне піратэхнічных сродкаў у грамадскіх месцах можа быць расцэнена як дробнае хуліганства (артыкул 17.1 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях Рэспублікі Беларусь), за ўчыненне якога прадугледжаны штраф у памеры ад 2 да 30 базавых велічынь або адміністрацыйны арышт на тэрмін да 15 сутак. Калі затрымаюць за выкарыстанне піратэхнічных вырабаў дзіця, то бацькі могуць быць прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці па артыкуле 9.4 Кодэкса аб адміністрацыйнай адказнасці Рэспублікі Беларусь («Невыкананне абавязкаў па выхаванні дзяцей»), які прадугледжвае папярэджанне або штраф у памеры да дзесяці базавых велічынь. Калі ж пры выкарыстанні піратэхнічных цацак будзе нанесена значная шкода здароўю або маёмасці навакольных, то парушальнікам можа паграажаць у тым ліку і крымінальная адказнасць.



**«Трэба разумець, што адзін выпадак, калі грамадзяне выкарыстоўваюць яе згодна з правіламі, інструкцыямі на этыкетцы, нікому не перашкаджаючы і не парушаючы грамадскі парадак. І зусім іншая справа, калі, скажам, петарды наўмысна кідаюць пад ногі».**

Таццяна Абозная звярнула ўвагу і на тое, што кожны, хто купляе петарды ў нелегальнага прадаўца, павінен разумець, што гэты тавар не прайшоў сертыфікацыю і можа быць небяспечным. Звязаныя з піратэхнікай траўмы і пашкоджанні маёмасці, на жаль, у сталіцы (ды і ў іншых гарадах) адбываюцца штогод і азмрочваюць святы дзясяткам людзей.

— У гэтай сувязі ў чарговы раз нагадваю аб неабходнасці выконваць правілы бяспекі, — падкрэсліла прэс-афіцэр. — Купляць піратэхніку трэба толькі ў афіцыйных гандлёвых пунктах. Не выкарыстоўваць яе ў хатніх умовах і не даваць малалетнім дзецям. Строга выконваць інструкцыю вытворцы на ўпакоўцы.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*